

***Грэ́баваць*** — пагарджаць кім-небудзь, чым-небудзь, выказваць непавагу, непрыхільнасць да каго-небудзь, чаго-небудзь.
***Свяшчэннадзе́йства*** — тут: выкананне бытавых традыцый (іранічнае).
***Завядзёнка*** — звычай, традыцыя.

## ІВАН МУРАВЕЙКА



## Лыжкай па лбе

Ну дык вось. Аднойчы ўся наша сям'я — дзед Апанас, мая мама і мой тата, я і мой старэйшы брат Янка — села за стол абедаць. А елі тады ўсе з адной міскі. Гэта цяпер розных талерак, сподачкаў, місачак, ке́ліхаў — усе шафы і камоды набіты, а ў той час... На пальцах пералічыш. Лыжкі былі драўляныя, з бярозы. Па-мойму, дарэмна цяпер грэбуюць імі. Драўляная лыжка лепей металічнай — яна ў самай гарачай стра́ве не становіцца гарачай.

Гэта — да слова. Я хачу пра іншае расказаць. Прыём стравы лічыўся не проста штодзённай патрэбнасцю, а найвышэйшай урачы́стасцю, свяшчэннадзе́йствам. І яго павінен быў зачынаць старэйшы ў сям'і. Такая была завядзёнка і ў нашай хаце. Пакуль дзед не возьме скібачку



Правообладатель Национальный институт образования



хлеба, ніхто не меў права пачынаць яду. А Янка аднаго разу не сцярпеў, мабыць, прагаладаўся дужа — першым акунуў сваю лыжку ў капусту (у той дзень на абед мама наварыла капусты). Сербануў, і вочы яго пачырванелі.

— Ну, як, не надта гарачая капуста? — запытаў дзед.

Янка моўчкі пакруціў галавой: маўляў, нармальная.

Дзед зачарпнуў поўную лыжку капусты... Усе заўважылі, што і ў дзеда, як і ў Янкі, пачырванелі вочы, нібы ў іх нехта запаліў агеньчыкі. Мы з напружаннем чакалі, чым закончыцца гэты незвычайны паядынак паміж дзедам і ўнукам. «Няўжо нічым? Шкада», — падумаў я. Мне хацелася, каб адбылося што-небудзь такое...



Правообладатель Национальный институт образования

Пафантазіруйце, што можа адбыцца.

І адбылося. Дзед павольна ўстаў і — бац лыжкай па Янкавым ілбе. Узяў нож і падаў яго Янку.

— Прыкладзі, каб гузак не ўсхапіўся.

1. Хто ўваходзіў у склад сям'і? Прачытайце.
2. Якія словы сведчаць, што падзеі, апісаныя ў творы, адбываюцца ў даўнія часы?
3. Якія правілы строга выконваліся ў сям'і? Чаму? Адказ падмацуйце радкамі з твора.
4. Чаму Янка аднойчы парушыў завядзёнку і першым акунуў сваю лыжку ў капусту?
5. За што дзед Апанас стукнуў унука па лбе лыжкай?
6. Якія думкі ўзніклі ў вас, калі дзед падаў унуку нож і сказаў: «Прыкладзі, каб гузак не ўсхапіўся»? Як гэта характарызуе старога?
7. Паразважайце, ці доўга Янка будзе крыўдзіцца на дзеда. Чаму? (Глядзіце форзац 1.)
8. Які эпізод з апавядання адлюстраваны мастаком на с. 14? Прачытайце адпаведныя радкі.
9. Падрыхтуйце выразнае чытанне твора. (Глядзіце форзац 1.)

**Давайце абмяркуем.** Успомніце, якія жыццёвыя ўрокі вы атрымалі ад сваіх родных. Раскажыце пра традыцыі, якія захоўваюцца за сталом у вашай сям'і.



Правообладатель Национальный институт образования